**Трусаў А.А.,** *дацэнт*

# ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ ЯК ЯСКРАВЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Кожны цывілізаваны народ імкнецца стварыць сваю дзяржаву, бо толькі ў ёй можна дасягнуць поўнага эканамічнага і культурнага росквіту.

Кожная дзяржава мае свае сімвалы, свае візітныя карткі, па якіх яе заўжды можна хутка адрозніць ад іншых краін. Шмат якія краіны вызначаюцца на міжнароднай арэне і ў паўсядзённым жыцці не толькі сваімі гербам, сцягам і гімнам, але і унікальнымі помнікамі архітэктуры.

Малюнкі гэтых помнікаў аздабляюць розныя рэкламныя вітрыны, іх выявы займаюць не апошняе месца на паштовых марках, паштоўках, металічных і папяровых знаках грашовай аплаты, узнагародах, турыстычных буклетах і картах.

Прычым кожная краіна мае адзін-два асноўныя помнікі-сімвалы і некалькі рэгіянальных альбо гістарычных, звязаных з нейкай вельмі важнай падзеяй у гісторыі гэтай дзяржавы. Адначасова мае свой сімвал і кожная дзяржаўная сталіца. Ён, дарэчы, можа супадаць ці не супадаць з асноўным сімвалам усёй краіны, але заўжды з'яўляецца адной з яе вызначальных прымет.

Сімвалам Расіі і яе сталіцы даўно лічыцца Маскоўскі Крэмль, прычым даволі часта ўжываецца толькі адзін элемент гэтага помніка архітэктуры - Спаская вежа з гадзіннікам. Пасля

Кастрычніцкай рэвалюцыі амаль кожны жыхар Расіі і ўсяго СССР добра ведаў Зімні палац у Санкт-Пецярбургу і нават крэйсер «Аўрору» - помнікі гісторыі і культуры, цесна звязаныя з гісторыяй Расіі XX ст. Тую ж тэндэнцыю можна прасачыць і ў гісторыі Францыі. Старажытны сімвал краіны, сабор Парыжскай божай маці, спачатку быў дапоўнены выявай Бастыліі (сімвалам французскай рэвалюцыі XYШ ст.); потым вобраз Парыжа і Францыі стаў неаддзельным ад абрысаў Эйфелевай вежы.

Пасля таго, як Беларусь зноў стала незалежнай краінай, ёй патрэбна таксама мець свае асноўныя і дадатковыя сімвалы, увасобленыя ў помніках архітэктуры і гісторыі. У савецкі перыяд сімваламі БССР былі ў нейкай ступені Курган Славы пад Мінскам, Дом урада і, вядома, помнік Леніну на аднайменнай плошчы беларускай сталіцы. Праўда, у апошнія часы існавання БССР на ролю сімвала Мінска стаў прэтэндаваць будынак Чырвонага касцёла, які на шматлікіх паштоўках меў сціплы подпіс «Дом кіно».

У той жа час сімвалам Літоўскай ССР была вежа Гедыміна з дзяржаўным сцягам наверсе, Латышскай ССР і горада Рыгі - славуты Домскі сабор XIII ст., а Украіны і Кіева - Кіеўская Сафія XI ст.

Зараз, каб уся еўрапейская і сусветная супольнасць магла вызначаць Беларусь як краіну Усходняй Еўропы з тысячагадовай гісторыяй, беларускія мастакі, дызайнеры і іншыя дзеячы нашай навукі і культуры павінны вызначыць і стварыць вобраз нашай краіны праз выявы і абрысы найбольш вядомых і каштоўных помнікаў айчыннага дойлідства.

Адным з такіх помнікаў можа стаць Полацкая Сафія, збудаваная 930 год назад,- першы мураваны будынак на тэрыторыі Беларусі. У мінулым годзе адзначыў сваё 500-годдзе славуты Мірскі замак, які зараз паспяхова аднаўляецца. Яго выява ўжо ёсць на беларускіх марках і нават на прыватызацыйных чэках «Маёмасць». Знаходзіцца замак у цэнтры краіны, мае добрыя падыходы і пад'езды і зможа стаць цэнтрам міжнароднага турызму.

Выява Камянецкай вежы XIII ст. у якасці валзянога знака ўжо трапіла на разліковыя білеты Нацыянальнага банка Беларусі, яна адлюстравана на шматлікіх сувенірных вырабах, паштоўках і паштовых марках.

У якасці сімвала Мінска можна і надалей выкарыстоўваць выяву касцёла св. Сымона і Алены, які неўзабаве адзначыць сваё стагоддзе.

Такім чынам, візітнымі карткамі Беларусі ў XXI ст. могуць стаць Полацкая Сафія, Камянецкая вежа і Мірскі замак. Цяпер справа за мастакамі, пісьменнікамі, архітэктарамі і дызайнерамі. Вобраз новай еўрапейскай дзяржавы не можа быць адарваны ад яе тысячагадовай гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ